Ірына Хадарэнка (Шумская) нарадзілася ў 1976 годзе ў Мінску. Скончыла музычную школу і гімназію № 1 імя Ф. Скарыны, а таксама Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Зараз вучыцца ў аспірантуры Беларускага універсітэта культуры. Друкавалася ў часопісах «Першацвет», «Маладосць», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», газетах «Чырвоная змена», «Знамя юности», «Народная газета», ў «Беларускім дайджэсце» ў Амерыцм.

**Першая кніга паэта**

**Ірына Хадарэнка**

# Чорная ружа

Вершы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1998

УДК 882.6-1
Б Б К 84(4Беи)6
Х14
Серыя заснавана ў 1968 г.
Прадмова
*Казіміра Камейшы*
Кніга выдадзена на сродкі Прэзідэнцкага фонду падтрымкі літаратуры і мастацтва

ISBN 985-02-0223 «

© І. М. Хадарэнка, 1998

## «ДАРЫЦЬ ЛЮДЗЯМ ДУШУ»

На паэтычным небасхіле час ад часу загараюцца новыя зоркі. І гэта радуе. Бо дадаецца больш святла ў свеце, таго святога святла, якое зыходзіць ад самой душы. Вялікі Гарсія Лорка зазначыў: «Місія ў паэта адна — адушаўляць у літаральным сэнсе, дарыць людзям душу». Місія, што і казаць, не простая. Думаеш заўсёды з трывогай пра гэта, калі шукаеш у халодна-ледзяных, рацыяналістычна скроеных вышуках тую ж душу і не знаходзіш яе. І па-добраму радуешся, калі контуры душы яскрава праглядаюцца ўжо ў першых спробах аўтара.

Некалькі гадоў назад у рэдакцыю часопіса «Маладосць» нясмела зайшла сарамлівая дзяўчына, нерашуча паклала на стол рэдактара паэзіі лісты з акуратным вучнёўскім почыркам. Вершы. Незнаёмае прозвішча — Ірына Хадарэнка, вучаніца гімназіі № 1 імя Францішка Скарыны. І знайшлося ў тых радках тое, што кранула:

Я стану тою зоркаю,
Што ўспыхвае раптоўна
І фальш атрутай горкаю
Знішчае паслядоўна.

А далей было пра тую ж душу:

Я маю здольнасць гэткую:
Змяняць сваё аблічча.

Адкрытая й таемная,
Душа кагосьці кліча.

І на самай справе, хоць і нясмела, але зорка загарэлася. І яна гарыць, не згасла.

І вось сёння Ірына Хадарэнка выходзіць да чытача са сваім першым паэтычным зборнікам «Чорная ружа». Да сваіх паэтычных вобразаў маладая паэтка крочыць, «блукаючы завулкамі ілюзій», часам пакідаючы «сонечны востраў» дзявоцкай летуценнасці, каб адчайна прайсці праз цёмныя і змрочнкалідоры рэальнасці, адчуць разам з дабрынёй і жорсткасць гэтага свету. Можа, таму і «чорная ружа» ў яе творы зусім не страшная і самотная, бо з душы на яе пялёсткі выпраменьваецца чалавечае святло.

У юнацтве заўсёды здаецца, што ты здольны ахапіць неахопнае, абняць неабдымпае. Гэтае наіўнае і ілюзорнае часта шкодзіць і Ірыне Хадарэнка. У аўтаркі з'яўляецца жаданне ўславіць і прыроду сонечнага Крыма, і працу акцёра на сцэне, і адначасова зазірнуць у майстэрню мастака, а потым і падзівіцца музыцы суседа-гітарыста «з верхняга паверха», і прысвяціць верш «творчым людзям усіх часоў і народаў», і паслухаць, як «восень іграе рытм-энд-блюз на саксафоне». І, вядома ж, часта ўсё гэта застаецца на ўзроўні жадання.

Страху, як кажуць, тут вялікага няма. Гэта — выдаткі росту. А падкупляе ў росшуках паэткі яе сталая разважлівасць, смелы подступ да тэмы, добрае імкненне да філасофскага асэнсавання жыцця. Як, скажам, вось у гэтых радках:

Не спяшайся скакаць праз масток,
Што схаваўся за тым небакраем.
Пі працяжна аношні глыток...
Ну, а Вечнасць? Яна пачакае.

Такіх радкоў нямала ў кнізе. Стала, на добрым узроўні напісаны і вянок санетаў «Лабірынты душы».

Не трэба палохацца ў вершах Ірыны Хадарэнка змрочных фарбаў. Душа, і асабліва душа паэта, мусіць рэагаваць як на светлае, так і на змрочнае. Хочацца вітаць прыход у айчынную паэзію новага імя. Ірына Хадарэнка прыйшла ў яе сваім шляхам і са сваім голасам.

*Казімір Камейша*

# *САДЫ СЕМІРАМІДЫ*

## НЕЗНАЁМКА

Хто ты? Як тваё імя, дзяўчына?
Мне звярнуцца да цябе няёмка.
Сумнымі прыгожымі вачыма
на мяне глядзіш ты, незнаёмка.

Пэўна, шчасця ты ў жыцці не маеш,
ад журбы не ведаеш спакою.
Хоць спрабуеш, а не разгадаеш:
дзе ж прычына кепскага настрою?

Знікнеш — і адзін я застануся,
быццам бы з табой не сустракаўся.
Зразумець цябе я ўсё імкнуўся,
ды, відаць, дарэмна спадзяваўся.

## СУМНАЕ СВЯТА

І за вокнамі дождж, і настрой сапсаваны,
і рабіць трэба тое, што так не люблю.
І жыццё — як асфальт чорны, утрамбаваны.
І міжвольна я гэтую рыфму лаўлю.

Нібы вязень, сяджу адзінока ў кватэры.
Растапіліся хмары, як мяккі алей.
У душы — безнадзейна, маркотна і шэра,
і не хочацца думаць, што будзе далей.

...А, дарэчы, сягоння — мае імяніны.
Я й забыла пра гэта, здаецца, зусім.
І сумую (хаця весяліцца павінна),
бо ляжыць цяжкі камень на сэрцы маім.

* * *

Блукаючы завулкамі ілюзій,
глытаючы святло ад ліхтароў,
імкнуся адшукаць нарэшце тое,
чаго на свеце ўвогуле няма.

І мне ніхто не зможа перашкодзіць
з рэальнасці ў нябыт праклaсці мост
і трапіць у струмень галюцынацый,
губляючы прытомнасць давідна.

Сутонне — для душы маёй калодзеж,
які шмат назбіраў сардэчных слёз
і выпівае з іх усю салёнасць.

Такі вось, дружа мой, сюррэалізм...

**АБСУРД**

Кветкамі ўслана дарога,
хтосьці ляжыць у труне,
а я не бачу нічога,
бо гэта — не для мяне.

Ціха рыпіць падлога,
булькаюць слёзы ў віне,
а я не чую нічога,
бо гэта — не для мяне.

Усе размаўляюць многа,
захліпваюцца ў мане,
а я не скажу нічога,
бо гэта — не для мяне.

## САДЫ СЕМІРАМІДЫ

Сляза самоты скнарліва сталее —
Семіраміда суму скорана сягоння.
Сасмаглае святло суздром сатлее,
сканаўшы са смутой самлелага сутоння.

Ссівелым старцам скурчыліся суткі.
Сузор'і стушаваны слотнымі слядамі.
Сакрэты сэрца, стомленага смуткам,
сасняцца светам са стракатымі садамі...

## ФАНТАЗІЯ

Пакідаючы сонечны востраў,
я ўзнімуся высока над морам
і пабачу пярэстасць адценняў
над салёнай, як слёзы, вадою.

Бесклапотна, звычайна і проста
растваруся ў касмічнай прасторы.
А мае бессмяротныя цені
ў свет пакрочаць таропкай хадою...

## ЭСКІЗ

Пер'е ад белай вароны
ноч праглынула, як пашча.
Толькі пагляд падазроны
цемру драпежную лашчыць.
Той, хто рассыпаў патроны,
любіць хадзіць у кароне.

## * * *

Ноч — налітая цемраю чаша.
Прыгублю яе востры настой.
Хай душа і смяецца, і плача
над бязладнаю доляй маёй.
*Л. Галубовіч*

Яшчэ адзін глыток начной атруты...
Цяпер ён для мяне — як паратунак
ад моцнага цяжару горкіх думак,
да стомленай свядомасці прыкутых.

Душы маёй маркотныя адценні
разносяцца па ўсёй прасторы снамі,
якія здольны лётаць кажанамі
скрозь марыва паўночных летуценняў.

* * *

Не люблю за тое раніцу,
што яна знішчае ноч,
ноч, якая не вяртаецца.

Не люблю за тое раніцу,
што яна канчае сон,
сон, які не паўтараецца.

Не люблю за тое раніцу,
што яна вяртае сум,
сум, які не забываецца.

**ЧОРНАЯ РУЖА**

> За чорнаю ружаю ідзі ўсцяж дарог,
> ідзі праз хлусню, цямноцце і дым,
> каб неяк убачыць блакітны стог
> і месяц зялёны ў тумане над ім…
>
> У. *Караткевіч*

Калі маўкліва поўня зіхацела
і тым святлом прастору апякала
так, быццам запаліць яе хацела,—
тады і ружа тая расцвітала.

Не белай, не чырвонаю, а чорнай
закрасавала ружа прыгажосцю.
І ад загадкі гэтай непаўторнай,
відаць, было ў ёй жудаснае штосьці.

Яе зрабілі сімвалам маркоты,
хоць і не бачылі, як слёзы пралівала.
З ёй сустракацца не было ахвоты,
бо не смяялася яна, а сумавала.

…Сарвалі ружу чорную аднойчы.
Яна завяла, высахла паволі,
ды толькі засталіся сум і горыч
сярод людзей. Не знішчыць іх ніколі.

* * *

Я адна сяджу ў цішы.
Што са мной — не разумею.
Я, напэўна, вар'яцею
ад самотнасці ў душы.

Гэта —сон або не сон?
Калі так, то дзе пачатак,
дзе працяг і дзе канчатак?
Што нагадвае мне ён?

Навакольны змрок маўчыць.
Напаўзае адвячорак.
Я пакуль не бачу зорак,
што з'яўляюцца ўначы.

У свядомасці сваей
я нямы адказ шукаю
і міжвольна адчуваю,
як ствараецца настрой.

* * *

Вясна... Цябе даўно чакалі,
цябе гукалі: «Прыйдзі хутчэй!»
Жанчыны вусны падфарбавалі,
знікае смутак з людскіх вачэй.

Пасля працяглай зімовай спячкі
павыпаўзалі ўсе з нор сваіх.
Ды толькі радасць, як скрып наждачкі,
што закранае мой чулы слых.

* * *

Бурштынавы бераг... Цябе ўспамінаю
і мушу вярнуцца туды,
дзе хтосьці нябачнай рукой разбівае
струмені імклівай вады,

дзе неба зліваецца з морам салёным
і ў п'яным экстазе дрыжыць,
дзе вецер халодны з імпэтам шалёным
бясконца кудысьці бяжыць.

Ды ён, гэты вецер,— гарэза свавольны,
што вусны мае цалаваў
зусім без дазволу і словы міжвольна,
нібы палюбоўнік, шаптаў.

А сонца з нябёс хітравата міргала,
і можна заўважыць было,
як сінія хвалі яно казытала
сваім залацістым святлом.

Я ўсё ўспамінаю, і сэрца імкнецца
туды, дзе ласкавы прыбой.
Бурштынавы бераг... Я мару сустрэцца
яшчэ неаднойчы з табой.

## З НАГОДЫ МОКРАГА СНЕГУ

Растрапаў вецер мне валасы,
на жмуткі і душу расцярушыць.
След ад светлай, як снег, паласы
боль у сэрцы наўрад ці заглушыць,

Атрымалася так, што ў жыцці
я бясконца ламала бар'еры.
Толькі як жа далей мне ісці
без кахання, надзеі і веры?..

Дождж і снег... Недарэчны сезон
затрымаўся, і я адчуваю
мімалётна, што твой парасон
ад маркоты мяне не схавае.

## КРЫМСКІ БЕРАГ
*Трыпціх*

**I**

Ватна-белыя аблокі
растварыліся ў блакіце.
Сонца — вогненнае вока —
затрымалася ў зеніце.

Бераг ліжуць хвалі мора,
хоць зусім ён не салодкі.
Неабсяжная прастора
паглынае яхты, лодкі.

Свет — у сонечных карунках...
Пад праменнем без панамкі
будаваць пачну я ў думках
зноў паветраныя замкі.

**II**

Сонца плавіцца. Ад спёкі
разгарачаны пясок.
Тоне ў марыве далёкім
гарызонту паясок.

Безупынна і няўмольна
па-над морам вее брыз.
Гэта вецер неадольны
праяўляе свой капрыз.

Мне прырода намалюе
трыпціх кроплямі вады.
У паўдзённы час люблю я
акунацца ў нікуды...

**III**

Зніклі ў змроку, у пустэчы
светлыя праменні.
Апусціўся цёплы вечар
кошкай на калені.

Сонны бераг ахінае
ноч смутой сваёю
і валодаць пачынае
небам і зямлёю.

Добра жыць пад Шляхам Млечным,
на сваёй планеце.
Ды, на жаль, нішто не вечна
ў гэтым тлумным свеце...

## МУЗЫКА ДАЖДЖУ

Плачуць хмары.
Мокнуць клёны.
Летні дождж са мной вальсуе.
З дынамічнасцю шалёнай
на асфальце
ён пульсуе.
Forte[1],
semplice[2],
veloce[3]...
Гэты танец —
страсці мора.
Што мне дождж цяпер прарочыць:
мора шчасця
альбо гора?

Рытм мелодыі б'е ў скроні,
як у песні без куплетаў.
Кропля
на маёй далоні —
бы сляза
душы паэта.

[1] Forte — гучна *(іт.)*.
[2] Semplice — проста *(іт.)*.
[3] V e l o c e — хутка *(іт.)*.

## ШАХРАЗАДА

Сонца устала над райскім Эдэмам,
і прачнуліся мілыя птушкі.
Гэта жонкі твае, шчабятушкі.
Ты сваім ганарышся гарэмам.

Джаміля, Мархабо і Зіёда,
Зульфія, Мукадаз і Анора...
З імі зведаў ты шчасце і гора,
з імі смутак спазнаў, асалоду.

Ды няма сярод іх чараўніцы,
той, што ўвечары казку раскажа,
на любое пытанне адкажа
і раскрыв душы таямніцы.

Па алеях дзівоснага саду
ты ўвесь час нетаропка гуляеш
і ў фантазіях светлых гукаеш:
«Дзе ж знайсці мне сваю Шахразаду?

## CAPRICCO

Фіялетавая птушка —
на атрутна-жоўтым фоне...
«Мне б за ёй узняцца ў неба!» —
абуджаецца капрыз.
Восень для мяне іграе
рытм-энд-блюз на саксафоне,
дрэвы моўчкі дэманструюць
бессаромны свой стрыптыз.
Хмель бяздумны і салодкі
мне свядомасць запаўняе.
Сонца промні рассыпае
па спакуслівай зямлі.
Шэраі мрояў і памкненняў
струны сэрца закранае.
Лісце кружыцца ў паветры,
як на лузе матылі.
У душы трапечуць мары
без журбы і без турботы,
восеньскі настрой паволі
пераходзіць у экстаз.
Віннаю ракой ліецца
мяккі водар пазалоты.
Ачмурэла і шалёна
наважол пануе джаз...

## ЗІМОВАЯ САНАТА

...І выпаў снег — прадвеснік абнаўлення,
заслаў зямлю бялюткім палатном.
У сэрцы абуджаецца натхненне
ад казак, што мне шэпча вецер-гном.

Узмах рукі нябачнага маэстра —
і ўраз заціхне паўсядзённы хор,
а ў галасах зімовага аркестра
пачне гучаць саната рэ-мажор.

## СУСЕДУ-ГІТАРЫСТУ
## З ВЕРХНЯГА ПАВЕРХА

Сыграй яшчэ! Няхай гітары гукі
мяне са светам мар нанова злучаць
і хоць на момант перапыняць мукі,
праліўшы ў сэрца мне бальзам гаючы.

Мелодыі вірлівыя струмені
кранаюць слых пяшчотаю сваёю,
і адпаўзаюць моўчкі ў сутарэнне
цяжар пакут з дакучлівай журбою.

* * *

Мабыць, варта было
са сцяжыны мне збочыць,
безразважна ў трох соснах душой заблудзіцца
і юнацтва святло
хмарай смутку азмрочыць,
каб у прыцемку гэтым наноў нарадзіцца...

* * *

У жыцці — як на шахматнай дошцы...
Не паспееш і кроку зрабіць,
а ўжо трэба наперад падумаць,
што суровы праціўнік не спіць,

што даўно, мабыць, ён прадугледзеў,
як атаку патрэбна адбіць
і якімі шляхамі ён зможа
у палон свой цябе захапіць.

* * *

Містэрыя пад назваю Тэатр...
Не вырвацца ўжо мне з твайго палону.
Цябе любіць я буду аж да скону,
містэрыя над назваю Тэатр.

Душа акцёра — вечны пілігрым
і да святла расчыненая брама.
Жыццё адных — як фарс, другіх — бы драма.
Душа акцёра — вечны пілігрым.

Няхай заўжды жыве Мастацтва свет!
Мы паімчым, як вершнікі ліхія,
насустрач гэтай велічнай стыхіі...
Няхай заўжды жыве Мастацтва свет!..

# *ВЕТРАЗЬ КАХАННЯ*

* * *

Я лаўлю твой пагляд, што заўважыў мой сум.
Мяне просіш ты зноў усміхнуцца.
Я хацела б забыць надакучлівы тлум
і далёка адсюль апынуцца.

Не, пакуль ты не зведаў маёй глыбіні,
хоць даўно зразумець мяне хочаш.
Не спяшайся, а лепей яшчэ зазірні
ў мае шэра-зялёныя вочы.

* * *

Стаяла ноч. Духмяны водар
заліў бязмежную прастору.
Дажджом акропленыя травы
спявалі калыханку хорам.
З-за хмары хітравата месяц
сачыў за грэшнаю зямлёю.
Я ў першы раз пашкадавала,
што развіталася з табою.

* * *

Пройдзе час, і вось цябе я страчу.
Знікнуць абяцанні ў забыцці.
Я цябе зусім не вінавачу.
Я — імгненне у тваім жыцці.

Шчасце атрымаеш ты з другою
і з другімі будзеш сябраваць.
Я зраблюся для цябе чужою.
Сапраўды, навошта ўспамінаць?

Не смяешся ты, а я не плачу.
Мае кожны з нас сваё жыццё.
Пройдзе час, я ўсё ж такі адзначу,
як знікае хутка пачуццё.

**КРЫХУ АБ КАХАННІ**

Я хацела верш стварыць лірычны —
мне прыемна з музаю спатканне,
толькі ж у жыцці маім у звычным
не знайшлося месца для кахання.

Што каханне? Будзе ці не будзе?
Смутак прынясе ці асалоду?
І чаму яго так прагнуць людзі?
Гэта ж рэчка, што не мае броду.

І даволі лёгка апынуцца
над яе загадкавай вадою.
Людзі, не паспеўшы азірнуцца,
тонуць у каханні з галавою.

З-за яго губляюць нават розум
і жыццё прыносяць у ахвяру.
Вас здзівіў мой невясёлы роздум?
Скажаце, што мне ён не да твару?

Можа, з цягам часу я змянюся
і па-іншаму зірну на гэта,
а пакуль гляджу я і дзіўлюся:
мараць аб каханні ўсе паэты.

* * *

Пакліч мяне, і я прыйду.
Магчыма, толькі не адразу.
Я сцежку да цябе знайду
і не звярну з яе ні разу.

Мяне спрабуеш разгадаць:
святло ці змрок? Анёл ці ведзьма?
Зашмат табе магла б я даць,
але ж трываю ледзьве-ледзьве.

Спяшайся, можаш не паспець
зрабіць мяне сваёю Музай.
Магу я іншага сустрэць
і абарваць між намі вузел.

**ДЗІЎНАЕ ВІНО**

Так недарэчна трапіўшы сюды,
я не магу пазбавіцца трывогі:
навошта ў гэты дом прышеслі ногі
мяне?
            Тут недалёка да бяды.

Я за сталом. У келіх льюць віно,
віно пад дзіўнай назваю «Каханне»,
а сэрца напаўняе адчуванне,
што за віном і донца не відно.

«Бяры і выпівай яго смялей»,—
мне кажуць.
                        Толькі я чакаю
чагосьці і маўкліва назіраю
за тым, што адбываецца далей.

Адзін юнак схапіў бакал хутчэй,
«Каханне» выпіў ён з вялікім смакам
і паказаў усім прысутным знакам,
што можна падліваць яму яшчэ.

Другі, яго таварыш, звар'яцеў.
Бясконца,
                        з ашалелымі вачыма,
ён паўтараў імя сваёй дзяўчыны
і дзесьці галаву сваю падзеў.

А трэці хлопец, побачён сядзеў,
не мог ніяк на гэты крок рашыцца,
але і ён быў змушаны скарыцца,
хаця зусім таго і не хацеў.

Цяпер ужо я ведаю: віно
з прыгожай дзіўнай назваю «Каханне»
яно для ўсіх нібы выпрабаванне
і за жыццё, магчыма, не адно.

* * *
У попел ператворыцца папера,
сусвет надзей пакрыецца смутой,
а кволая, скалечапая вера
загіне пад бязлітаснай тугой.

У памяці маёй яскравай стужкай
праскочаць незнарок былыя дні,
і я згаджуся стаць тваёю служкай
у дзіўны час паўночнай цішыні...

* * *

Ці ты бачыць мяне не хочаш
і не любіш са мной спаткацца?
Як сустрэну — адводзіш вочы,
не жадаючы прывітацца.

Часам змрочны ты і маўклівы
і людзей заўважаць не здольны.
Бачу я, як з усмешкай кплівай
ты глядзіш на свет навакольны.

Не, цябе я не разумею.
Мы з табой — як зямля і неба.
З цягам часу мы пасталеем,
толькі разам нам быць не трэба.

**ВЕТРАЗЬ КАХАННЯ**

Мы з табою, каханы, знайшлі
свой прытулак у моры жыццёвым,
апынуўшыся на караблі
пад уладаю сіл пачуццёвых.
Мы на хвалях надзеі плылі
у краіну Здзяйснення Жаданняў.
І шчаслівыя разам былі,
бо ахоўваў нас Ветразь Кахання.

Апусціўся аднойчы туман
над шырокай прасторай марскою.
І змяніў нашу шчырасць падман,
што прыйшоў з пагалоскай людскою.
Разлучыў нас з табой жорсткі лёс,
боль у сэрца прынесла расстанне.
Стала мора салёным ад слёз,
бо парваўся наш Ветразь Кахання.

Больш мінулага нам не вярнуць,
бо цяпер ад мяне ты далека.
Човен роспачы хвалі нясуць,
і плыву я на ім адзінока.
Пройдзе час і развее туту,
знікнуць рэшткі былых спадзяванняў.
Толькі я ўсё ж забыць не змагу
наш з табой светлы Ветразь Кахання.

* * *

Я не бачу цябе. Мае вочы
сеткай роспачы засціць туман,
з вуснаў капае смутная горыч —
я даўно прадчувала падман.

Я не бачу цябе, хоць ты побач.
Больш ужо немагчыма кахаць.
І гатова я клікаць на помач,
ды навошта? Мо лепей стрываць?

* * *

Твой смех падобны да вострае брытвы.
Ён рэжа мяне, калі чую яго.
Але я не буду прыгадваць малітвы,
каб абараніцца ад смеху твайго.

Магчыма, ты сам не зусім адчуваеш,
што робіць са мной гэты д'ябальскі смех.
Мяне ты нібы да спакусы схіляеш,
мяне з непрыкметнасцю ўводзіш у грэх.

* * *

Мы абое чагосьці шукалі
і знайсці не маглі доўгі час...
На загадку застаўся адказ
з недапітым віном у бакале.

Ты маўкліва курыў папяросу,
я глытала гаркавы той дым.
Ты скарыўся жаданням зямным,
я лунала ізноў у нябёсах.

**ПАКУТЛІВАЯ ІЛЮЗІЯ**

Ты жывеш, як Праметэй прыкуты,
быццам карабель, што сеў на рыф.
Ці не ад таго твае пакуты,
што кахання прага — толькі міф?

Адзінота навальнічнай хмарай
моўчкі завісае над табой.
Са змарнелым ад самоты тварам
ты уступает з ёй у жорсткі бой.

Я з'яўлюся, як маланка з неба,
і цябе параню вастрыём.
А кахання мне твайго не трэба,
проста я люблю іграць з агнём.

**СПАКУСА**
*Санет*

Я хацела б стаць тваёй Лалітай,
у палон жадання залучыць
розум твой, а сэрца апаліць
страсцю неабсяжна прагавітай.

Гэтак яблык, спеласцю наліты,
над зямлёй спакусліва вісіць...
Нездарма душа мая трымціць,
там — Эрата з Эрасам спавіты.

І не асуджаецца сумленнем
шэраг непрытоеных памкненняў.

Ты пакуль прыхільнік раўнавагі.
Толькі ведай, што надыдзе час
і замест халоднае развагі
хваля пачуцця накрые нас...

* * *

Калі б вядомы Херсанес
альбо славутыя Афіны
зноў узнялі свае руіны
і свет антычнасці ўваскрэс,

калі б патрапіць мне туды
ў сваім цяперашнім узросце,
то без аглядкі на кагосьці
я пражыла б свае гады.

Я стала б жрыцаю любві,
неўтаймаванаю гетэрай.
І быў бы мой дэвіз: «Жыві,
ні ў чым не ведаючы меры!»

## ВАНДРОЎНЫ ГАЛАНДЗЕЦ

…J'aime l'horreur d'etre vierge et je veux
Vivre parmi l'effro… que me font mes cheveux…

*МалармЭ*[4]

Як водарасці, валасы мае
вільготным холадам кранаюць цела.
Душа яму ўсю ўладу адцае
з той хваляй, што раптоўна наляцела.

З той хваляй, што прынесла неспакой,
кроў пачынае свой нястрымны танец.
І толькі ты адзін таму віной,
марская здань, Вандроўны мой Галандзец.

Між намі пачынаецца вайна
на доўгі час, да канчатковай стомы.
Трымайся, спакушальнік-сатана,
бо хто з нас пераможа — невядома…

* * *

Ты не зваблівай, не спакушай,
бо аб гэтым потым пашкадуеш,
да таго дайсці не прымушай,
ад чаго так проста не ўратуеш.

Як жа побач мне з табой прайсці
і ў бяздонне пачуцця не ўпасці?
Як жа пастарацца абысці
небяспечны вір шалёнай страсці?

Не спрабуй агеньчык запаліць —
можа ўспыхнуць полымя раптоўна.
І тады, відаць, у ім згарыць
стрыманасць, халоднасць і тактоўнасць.

[4] Я люблю ганьбу быць цнатлівай і хачу жыць
сярод жаху, які нараджаюць мае ванасы *(фр.)*.

## ГЭТА НОЧ...

У мяне ёсць дом,
толькі ён без даху.
Сэрца — пад ільдом
прывіднага жаху.

У нябесны порт
заплывае месяц.
У душы сам чорт
вір атруты месіць.

І ўскіпаю я
ад жаданняў дзікіх.
Гэта ноч-змяя
нараджае крыкі.

Гэта ноч з мяне
выціскае стогаы.
Ценем на сцяне
вар'яцеюць сцёгны.

Адчуваю смак
слодычы і болю.
Ноч мне дорыць знак
спасціжэння волі.

## ПЕСНЯ МЕНЕСТРЭЛЯЎ

На папялішчы кахання
знікнуць былыя мары.
Толькі гучыць у сэрцы
сумны напеў гітары.

Плачуць бясслёзна вочы,
твар — як заппсаваны.
І паступова ўпадае
розум у стан нірваны.

Рэшткі забітых пачуццяў
блытаюцца ў павуціне.
Хуткая смерць кахання —
быццам на іільяціне.

Гэта няцяжка прадбачыць.
Так яно ўсё і будзе.
Каханне знікае ў пакутах...
Навошта ж яно вам, людзі?..

# ***БЕЛАРУСКІЯ МАТЫВЫ***

* * *

У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваёй нуды.

*М. Багдановіч*

Душа мая — вандроўніца,
што, прагнучы напіцца,
шукае і не стоміцца
чароўную крыніцу.

Хутчэй знайсці яе, хутчэй!
Яна цячэ, бруіцца
далека ад чужых вачэй,
як быццам таямніца.

Я сцежку да крыніцы той
шукаць упарта буду.
Там толькі я знайду спакой
і смутак свой забуду.

* * *

О святая зямля Беларусі!..
Не магу я глядзець без болю,
як у цяжкіх пакутах і скрусе
ты спрабуеш здабыць сабе волю.

Быццам чорны рэліктавы бусел,
ты сваю азначаеш долю.
Хто ж выконваць цябе прымусіў
недарэчную гэтую ролю?..

## БЕЛАРУСЬ

Гэта тая зямля, дзе бліскучыя зоркі
акунаюцца ў сіні калодзеж азёр.
Гэта тая зямля, дзе зялёныя ўзгоркі,
дзе ў расе на траве тчэцца сонечны ўзор.

Гэта тая зямля, дзе сумуюць крыніцы,
дзе на небе ўстае месяц жоўты ўначы,
дзе на сцежках балотных жывуць таямніцы,
дзе журчыць ручаёк праз імхі, паўз карчы.

Гэта тая зямля, дзе народ мой цярплівы.
Ён цудоўныя казкі і песні стварыў.
Толькі ў лёсе сваім быў і ёсць нешчаслівы:
мову страціў амаль, памяць продкаў зіубіў.

Гэта тая зямля, дзе ў гарачых прызнаннях
перад ёй мы, схіліўшы галовы, стаім.
І аб ёй, дарагой, сняцца сны да світання:
Беларусь, ты заўсёды у сэрцы маім.

* * *

Мова — быццам кветка тая,
што цвіце адным на радасць,
а ў кагосьці выклікае
непрыхільнасць, злосць і зайздрасць.

Беларускай мовай можна,
калі хочаш, авалодаць,
як жанчынаю прыгожай,
атрымаўшы асалоду.

І таму адны імкнуцца,
бы з каханай, з ёй спаткацца,
а другія спадзяюцца
зганьбаваць і насмяяцца.

## У КУПАЛЬСКУЮ НОЧ

*Маёй дарагой бабулі*
*Кацярыне Хрысанфаўне Хадарэнка*

**I**

Сто год таму, а можа, нават дзвесце,
купальскай ноччу — у чароўны час —
сышліся ведзьмакі ў тым самым месцы,
дзе найстарэйшы ясень рос якраз.

Як срэбны рог, вісеў над Лысай Горкай
загадкавы халодны маладзік.
І несліся з-пад ясеня гаворка,
свіст лесуноў, страшыдлаў дзікі крык.

Ад нечысці схаваўся ў сваіх хатах
увесь стары і прымхлівы народ.
...Нібыта рыцар у сталёвых латах,
стаяла ноч, чакаючы прыгод.

А маладыя хлопцы і дзяўчаты
ля вогнішча вадзілі карагод,
не баючыся ведзьмакоў кудлатых,
спявалі весела, пазбыўшыся нягод.

Па звычаю дзяўчаты варажылі.
Яны ўпляталі з кветкамі ў вянкі
імёны тых, якімі даражылі,
і беглі з гэтым скарбам да ракі.

Сяброў сваіх у прыцемку гукалі
ды жартавалі з імі ад душы,
а потым кветку-папараць шукалі
да самага відна ў лясной глушы.

**II**

Адзін з хлапцоў, каваль-асілак Янка,
з Марыйкаю — дзяўчынаю сваёй —-
пайшоў на вечаровую гулянку
шпацыраваць пад Лысаю Гарой.

Чароўны час спрыяе дзіўным рэчам...
Пад ясень пара незнарок зайшла,
туды якраз, дзе д'ябальская нечысць
сабе прытулак для гульні знайшла.

Салодкі голас заклікаў дзяўчыну:
«Хадзі, Марыйка, ты хутчэй да нас!»
Руку ёй нехта працягаў з галіны —
руку Марыйка падала ў адказ.

І раптам невядомая ёй сіла
дзяўчыну ухапіла як магла.
Спужаўшыся, яна загаласіла,
ды вырвацца з няволі не змагла.

Тады асілак Янка раззлаваўся,
Марыйку з рук паганых ірвануў
і вызваліў, а потым паднапяўся,
схапіў чарцяку, ў сажалку спіхнуў.

Ніводны чорт там болей не з'яўляўся,
хоць шмат гадоў мінула з той пары.
А ясень і дагэтуль захаваўся.
Стаіць, шуміць на Лысае Гары...

## ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІКАМ

Брыдка слухаць мне вашы прамовы.
Іх стрымаць вы ў сабе не маглі.
Вы забылі, напэўна, панове,
што ёсць гонар у нашай зямлі.

Што яна Беларуссю завецца
ўжо даўно і, відаць, нездарма,
што калісьці і ёй давядзецца
быць свабоднай і жыць без ярма.

Гэты час — сапраўды ліхалецце.
Шмат чаго мы хацелі б змяніць.
Толькі памяць не кінеш на смецце,
бо гісторыю нельга забыць.

Вы крычыце нахабна тырады:
«Бачце ўсе: кожны з нас — патрыёт!»
А як прыйдзеце вы да улады —
вас зусім не турбуе народ.

Вы ізноў абражаеце мову...
Гэта — вашай пагарды пячаць.
Выбачайце за жорсткія словы,
толькі я не магу больш маўчаць.

* * *

Горкія рысы
вызначаюць цяперашні воблік роднай краіны:
незалежнасць,
якая грунтуецца на папяровым падмурку;
мова,
якая адпрэчваецца народам,
быццам іншароднае цела;
мастацтва,
якое, нібы жабрак, просіць міласці;
культура,
якая аплёўваецца ўзвысіўшымся люмпенам;
асоба,
якую падаўляюць сваёй большасцю
і важкасцю масы...

Ці ж можна спакойна пазіраць на ўсё гэта?..

* * *

Мой самотны і велічны край!
Ты згубіўся ў маўклівай глушы.
Лепш на свеце не знойдзеш, бадай,
для змарнелай ад смутку душы.

Доля горкая нашай зямлі
між Харыбдай і Сцылай ляжыць.
Ой, чаму ж не паўстала, калі
распіналі цябе на крыжы?..

# *КРЫЛЫ ПЕГАСА*

## КРЫЛЫ ПЕГАСА

О гучнае імя паэта!
Ці маю права на яго?
Ды і навошта мне ўсё гэта?
Што атрымаю ад таго?

У гэтым свеце мне цікава
спазнаць усё, што існуе.
І творчая любая справа
нібыта пастка паўстае.

Яшчэ растуць Пегаса крышы,
растуць за спінаю' маёй.
Паэзіі палёт імклівы
цяпер вянчаецца са мной.

## CREDO

> Segui il tue corso, a lascia
> dir le genti[5]
>
> *Дантэ*

Незалежнай асобаю стаць
і застацца ёй — цяжкая справа.
Вы мой шлях асудзілі, відаць?
Толькі хто даў вам гэткае права?..

Не хачу я пісаць на заказ,
улагоджваць не буду нікога.
Хай праслявяцца іншыя ўраз,
а ў мяне — не такая дарога.

* * *

Ляжыць знаёмы сшытак на стале.
Нямала напісана ў ім, але
на думцы незнарок сябе лаўлю:
«Каму патрэбна тое, што раблю?»
Бацькам — дзеля таго, каб ганарыцца,
сябрам — дзеля таго, каб пахваліцца,
рэдактарам — каб ненгга друкаваць,
а крытыкам — каб раскрытыкаваць.
Вось так і дзеляць спадчыну паэта.
Але ў мяне была не тая мэта...
Каму цікавы свет маёй душы?
Сама сабе ў адказ: «А ўсё ж пішы!»

---

[5] Ідзі сваёй дарогай, і няхай людзі кажуць, што хочуць *(іт.)*.

* * *

Паэтаў пачынаючых няма,
як зорак пачынаючых ці неба...
*А Брусевіч*

Кажуць, што паэты
жывуць у іншым свеце.
Кажуць, яны, быццам дзеці,
блукаюць у тлумным жыцці.

Але недакладна гэта.
Яны жывуць побач з намі.
Іх мары, надзеі, жаданні
зямныя ў сваім адкрыцці.

Адрозніваюцца толькі
яны светаўспрыманнем
і думак адлюстраваннем —
інакш і не можа быць.

Творчых людзей столькі,
колькі зорак на небе.
І іх заўважаць нам трэба,
каб таленты не разгубіць.

## НАЧНЫЯ РЫФМЫ

Ноч — аспідная кошка. І пад кіпцюрамі
я, выгінаючыся, моўчкі боль цярплю.
Крывёй акропленымі, даўкімі радкамі
бязлітаснага звера досыта кармлю.
*Э. Межэлайціс*

А ноч не проста кошка, ноч — пантэра,
і для яе не існуе мяжы.
Яна з'яўляецца ў маёй кватэры,
каб кіпцюры ўсадзіць у глыб душы.

Бязлітасная цемра-шаляніца
мне сэрца развярэджвае ізноў.
І вершы пачынаюць струмяніцца
з параненай душы, нібыта кроў.

Ноч цісне на мяне сваім цяжарам,
яна ўзбуджае прагавіты мозг.
Я ўся палаю ўнутраным пажарам,
і думкі аплываюць, быццам воск.

* * *
Заўсёды творчасць і мастацтва
крыху нагадваюць вар'яцтва.

Для дасягнення пэўных мэт
патрэбны талент ды імпэт.

Быць творца можа эксцэнтрычным,
свавольным, дзіўным і нязвычным.

Не есці можа ён, не спаць,
абы тварыць, абы ствараць.

# У ПОШУКАХ ІСЦІНЫ

## АЎТАПАРТРЭТ

Мой вобраз — змрок пад вэлюмам маркоты.
Паводзіны — сугучна новай ролі,
а шчырасць — у люстэрку адзіноты,
і толькі там жыве карэнне волі.

Сумненні безліч ісцін пахіснулі,
і формы растварыліся ў прасторы.
Паветраныя замкі патанулі,
нібы міраж, у рэчаісным моры.

Ідэі — паліва для ззяння зоркі.
Экстравагантнасць — існасці адбітак.
Я п'ю жыццё, як быццам воцат горкі,
і свет душы — адзіны мой набытак.

Афелія, Мінерва, Неферціці,
Сібіла, Муза, Чорная Паненка...
З усіх асоб адзіную стварыце —
І ўзнікну я — Ірына Хадарэнка.

## SUB SPECIE AETERNITATIS[6]

Перад усімі паўстаюць пытанні:
дзе ўрэшце можна шчасце напаткаць?
Яно ў багацці, славе ці ў каханні?
Ці варта ўвогуле яго шукаць?

Дзе сэнс схаваны і якая мэта
павінна быць у кожнага ў жыцці?
Не вырашылі людзі шчэ дагэтуль,
хоць і пайшлі далёка ў развіцці.

* * *

Не трэба аб мінулым сумаваць.
Яно да нас не вернецца ніколі.
І нам ужо туды не трапіць болей,
але яго нам нельга забываць.

Шкада, што зноў жыццё нам не пачаць,
ды ў памяці ў мінулае ёсць сцежка.
На вуснах лёгкая мільгае ўсмешка,
калі пачнём мы нешта ўспамінаць.

Нам застаецца лепшага чакаць,
прымаць жыцця салодкую атруту
і праз шматлікія прайсці пакуты,
каб толькі жыць на свеце, не ўміраць.

[6] Пад знакам вечнасці *(лац.)*.

* * *

Ах, колькі незвычайных скарбаў
захоўвае душа мая!
Палітра колераў і фарбаў,
але мастак адзіны — я.

І я нікому не дазволю
яе нахабна апляваць,
бо мецъ душа павінна волю
і незалежна існаваць.

Няхай ні чорта, ані Бога
душа мая не прызнае,
але ў жыцці амаль нічога
няма ў мяне, апроч яе.

**АКРАВЕРШ**

Ісці за ісцінай — занадта небяспечна:
Сарвацца ў бездань можна незнарок.
Цаной пакут ствараецца прарок,
І шлях ягоны скіраваны ў вечнасць.
На жаль, магчыма доўга так ісці,
А ісціну да скону не знайсці...

## БЯССЭНСНАСЦЬ

Навошта свет, быццё, прастора, час,
істота, развіццё, нябыт і вечнасць,
прагрэс, рэгрэс, процістаянне мае,
смерць, нараджэнне, жорсткасць, чалавечнасць?

Навошта верыць, помніць, разважаць,
кахадь, сварыцца, жартаваць, нудзіцца,
ствараць, знішчаць, рэтушаваць, скажаць,
ахоўваць, помсціць, ратаваць, тапіцца,

шукаць у з'явах сэнс, а ў странах —смак
і за жыццё плаціць вялікім коштам?
Усё ж знікае ў рэшце рэшт, аднак...
Навошта і пытаць тады: «Навошта?»

* * *

Культура — кволае стварэнне,
і маладое пакаленне
яе павінна зберагчы.

Хоць ёй далі цяпер свабоду,
аднак душа майго народа
і плача горка, і крычыць.

Пячэ на целе ейным рана,
але казаць пакуль што рана
пра ўсеагульны заняпад.

Культура жыць заўсёды будзе.
З яе здабыткаў могуць людзі
стварыць сапраўдны зоркапад.

## Я НЕ ЛЮБЛЮ

Я не люблю, когда мне лезут в душу.
Особенно когда в нее плюют.
У *Высоцкі*

Я не люблю самотнага жыцця,
жалобных скаргаў, дробных інтанацый,
бясконцых настаўленняў і натацый,
мяшчанства, пошласці і прагі набыцця.

Я не люблю пасрэднасці ва ўсім
і шэрасці імкненняў і пачуццяў.
Так можна ў бруднай яме апынуцца,
а то і страціць твар свой назусім.

Я не люблю падманваць кожны раз,
бо шчырасць зразумець не ўсе гатовы.
Я не люблю лухту, пустыя словы,
дабро, што выстаўляюць напаказ.

Я не люблю, калі мяне цкуюць
і сустракаюць з помслівай ухмылкай,
калі капаюцца ва ўсіх памылках
і творчасцю займацца не даюць.

Я не люблю (а трэба ўсё ж трываць),
калі ўва мне асобу падаўляюць
і большасці скарыцца прымушаюць,
каб ведала, што вольнай не бываць.

Я аб адным сама сябе малю:
каб толькі ад жыцця мне не стаміцца,
ушчэнт не разлюбіць, не разлюбіцца,—
бо ў свеце шмат чаго я не люблю.

## ПРЫСУД

Ля шырокай сцяны, дзе мяне расстраляюць,
я не плачу, хаця і нясцерпны мой боль.
Толькі думкі свядомасць маю запаўняюць
ды пакутліва цісне нябесная столь.

Расстраляюць мяне не з ружжа, не з вінтоўкі,
а маўклівай пагардай знаёмых вачэй.
Будуць кпліва ўсміхацца былыя сяброўкі,
рыхтавацца да новых расстрэлаў хутчэй.

У абсурдным жыцці я памылку зрабіла
і цяпер непазбежна павінна чакаць
тую кулю, што покуль мяне не забіла,
але ўжо мае сэрца імкнецца спаткаць.

* * *

Жыццё часам здаецца мне
вялікай жалобнай працэсіяй.
...Нехта займае ложа на катафалку,
кагосьці нясуць у труне,
хтосьці ідзе сваёю хадою,
несучы крыж на плячах...
Але ўсе яны рухаюцца ў аднолькавым напрамку.
...У аднаго дарога ўслана цудоўнымі ружамі,
у другога — простымі рамонкамі,
у трэцяга — каменнем і палыном...
Але ўсе гэтыя дарогі рана ці позна
сыходзяцца ў адзіным месцы.

Нараджэнне для людзей — заўсёды свята.
Чаму ж яны тады так баяцца смерці?
Можа, гэта — другое нараджэнне?..

* * *

Заснуць ад водару магнолій
на фоне квецені садоў
і больш не аднавіць ніколі
стракатасць маладых гадоў.
Не смерці прагнучы, а волі,
вярнуць сабе апошні доўг,
каб не з тугой, а з весялосцю
пайсці ў нябыт па хісткім мосце...

* * *

Дайце мне, дайце кавалачак неба!
Дайце адпіць мне свабоды глыток!
Гэта звычайная вельмі патрэба —
накіраваць адчуванняў паток.

Не, не кахання ў жыцці я шукала,
проста падтрымку хацела набыць.
Толькі замест разумения спаткала
смутак, які немагчыма згубіць.

Змрочныя думкі — не, гэта не жарты.
Разам са мной яны ўсюды былі.
Дайце ж мне пераканацца, што варта
жыць і тварыць мне на гэтай Зямлі.

* * *

Нахапаўшыся нігілізму,
жыць зусім мне не стала лягчэй.
Той ланцуг, што мне думкі сціснуў,
я імкнуся парваць хутчэй.

Па цнатлівасці справіўшы трызну,
пад уплывам вар'яцкіх начэй —
я гляджу на людзей скрозь прызму —
дзікім позіркам сумных вачэй.

* * *

Якое цяжкае жыццё!
І гэты крыж мне трэба несці.
Ужо зусім не адкрыццё,
што з цягам часу знікну дзесьці.

І мне прызначыў лес гартаць
старонкі кнігі незнаёмай
і ў ёй імкнуцца адшукаць
свой шлях, пакуль што невядомы.

Памылка ў выбары тваім —
і праз яе ўсё сапсуецца.
Жыццё губляе сэнс, і ў ім
нічога больш не застаецца.

Няхай нядоўгім будзе шлях,
але яскравым і бліскучым,
каб адчуваць жыцця размах
і сэрцу не было балюча.

* * *

З упартай сілай лёс імкнецца
зрабіць мяне абмежаванай
і да ўсяго прыстасаванай.
Ці гэта толькі мне здаецца?

Усё жыццё мне давядзецца
прытрымлівацца нейкіх рамак
і думак выбіраць напрамак.
Ці гэта толькі мне здаецца?

Куды ад роспачы мне дзецца?
Трывожны смутак нарастае,
як ланцугом мяне сціскае.
Ці гэта толькі мне здаецца?

Пакуль жыву і сэрца б'ецца —
не супакоіцца свядомасць.
Я ціха крочу ў невядомасць.
Ці гэта толькі мне здаецца?

* * *

Я праклінаю гэты лес!
Мяне ён, быццам мяч, штурхае,
але ў вачах не будзе слёз —
я іх ужо даўно не маю.

Я ў гэтым свеце незнарок
сябе няёмка адчуваю,
бо гое мой заўважыў зрок,
што шмат людзей не заўважае.

Праходзіць побач шэраг з'яў,
жыццё на маскарад падобна.
У ім хагіае брудных спраў,
нянавісці і крыўды дробнай.

У манатоннасці падзей
знікаюць творчыя матывы.
Глядзець мне цяжка на людзей,
бо свет іх жорсткі і хлуслівы.

А дні ляцяць, бягуць гады,
дарэмна людзі час губляюць.
Аб тым, што знікнуць назаўжды,
яны ў жыцці амаль не дбаюць.

* * *

Я — актрыса ў тэатры абсурду,
у мяне недарэчныя ролі.
Іх выконваць да скону я буду,
незалежна ад думак і волі.

Тут пануюць нямыя законы
і вышэйшая сіла ўладарыць.
З нараджэння да самага скону
аб свабодзе не варта мне марыць.

* * *

Дзьміце ў трубы і біце ў літаўры!
Назірайце рашаючы бой.
Я, нібыта Тэсей з Мінатаўрам,
пачынаю змагацца з сабой.

Немагчыма ўвесь час не змяняцца
і стабільнасці не парушаць.
Быццам нітачка, можа парвацца
ад страшэннай дылемы душа.

У жыцці вырашаць вельмі важна,
якім шляхам пакрочыш далей.
Выбар здзейсніць складана і страшна,
ды адсутнасць яго — шчэ страшней...

* * *

К простоте возвращаться — зачем?
Зачем — я знаю, положим.
Но дано возвращаться не всем.
Такие, как я, не можем.

*З. Гіпіус*

Мне кажуць людзі: стань прасцей,
спусціся на зямлю з аблокаў.
З усмешкай разам будзь часцей —
і зможаш ты пайсці далека.

Мне кажуць: хопіць сумаваць
і філасофіяй займацца.
Навошта цяжкасці шукаць?
Лепш проста жыць і забаўляцца.

Я не імкнуся да таго,
каб на карысць усім змяняцца.
Сабе жадаю аднаго:
самой сабою заставацца.

* * *

*Д.*

У нас з табою розныя шляхі.
Навошта ж ты імкнешся разгадаць
характар мой і ўсе мае іграхі
настойліва стараешся пазнаць?

Дзеля таге ты хочаш зразумець
і да канца раскрыць усю мяне,
яшчэ адну каб перамогу мець
цяпер на сваім ліку. Так ці не?

Альбо ты любіш проста так капаць
маю душу, каб нешта ў ёй знайсці
і вопыт гэткім чынам набіраць,
нарэшце каб да сугнасці дайсці?

Расце ў маёй душы цярновы куст,
і кветку хочаш ты з яго сарваць.
Што ж, у цябе зусім някепскі густ.
Спрабуй, табе не буду замінаць.

Ды толькі, не скрываваўшы рукі,
набыць яе не дазваляю я.
Навошта шлях пакутніцкі такі?
Ты ж не належыш мне, я — не твая...

* * *

Я стану тою зоркаю,
што ўспыхвае раптоўна
і фальш атрутай горкаю
знішчае паслядоўна.

Ці мо калючай ружаю,
што зацвітае ў багне
і ўпарта з сілай мужнаю
свабоды вечна прагне.

Альбо слязой празрыстаю,
што поўніцца адчаем
і за журбой імглістаю
жыцця не прыкмячае...

Я маю здольнасць гэткую:
змяняць сваё аблічча.
Адкрытая й таемная
душа кагосьці кліча.

**СУЗІРАННЕ**
*Трыпціх*

**I**
З мройнага келіха злой рэчаіснасці
я выпіваю атруту спазнання.
Розум імкнецца дабрацца да існасці
шляхам аналізу і сузірання.

Дні пралятаюць агаямі стракатымі.
Іх аднавіць не змагу я ніколі.
Лёс абмяжоўвае дзеянні кратамі,
супрацьстаіць авалоданню воляй.

Воля, канешне,— паняцце адноснае.
Тут абсалютаў ніякіх не будзе.
Толькі памкненне да волі — не ўскоснае;
нават рэальнасць яго не астудзіць.

Нельга заўжды заставацца на ростанях,
рухацца трэба скрозь час і прастору.
Сцежкі да ісціны будуць няпростымі.
Так павялося ў жыцці a priori[7].

Час так няўмольна і жорстка адлічвае
дні і гады, што ў нябыт адыходзяць.
Моўчкі ўстаюць яны срэбнымі лічбамі
і запаўняюць свядомасці роўнядзь.

Доўга блукаючы з памяццю-кошыкам
праз чараду розных з'яў і здарэнняў,
знойдзеш адказ на прадмет сваіх пошукаў:
жыць трэба ў вечным імпэце стварэння.

**II**
Жыццё, як быццам трапяткая ніць,
з клубка Сусвету цягнецца спрадвеку...
Як дорага прыходзіцца плаціць
за права называцца чалавекам!

Ніколі той не скончыцца клубок,
і залатая нітка не парвецца.
Чаму ж тады амаль што кожны крок
без мук і болю людзям не даецца?..

Той, хто блукае між высокіх гор,
у пашчу — бездань рызыкуе ўпасці.
Але ж вярэдзіць сэрца злы дакор
за недасяжнае, як сонца, шчасце.

А што ёсць шчасце? Прывідны міраж,
нядоўгі час выдатнага настрою.
Але чакай: прымусіць антураж
цябе ўжо хутка ўзяцца зноў за зброю.

Вялікай змрочнай хваляй наляцяць
бязладныя і хіжыя нягоды.
І будуць безупынна падаўляць
здзяйсненне мар і творчую свабоду.

---

[7] Незалежна ад вопыту, спрадвечна (лац.).

Аднак жыццё — не пустка і не гаць.
Яно бяжыць іскрынкай па спружыне...
Імкніся ж, чалавек, асобай стаць
і след пакінуць на сваёй сцяжыне!

**III**

Вір жыццёвы бясконца кіпіць,
як гарачая магма ў вулкане.
І ніхто з нас не ў стане спыніць
гэты вечны закон існавання.

У касмічным харале пяе
сваю партыю наша планета.
А ці ёсць у трымценні яе
хоць якаясьці пэўная мэта?

Ёсць працэсы і з'явы, якім
немагчыма знайсці тлумачэння.
На Зямлі кожны з нас — пілігрым,
што шукае сваё прызначэнне.

Чалавецтва, ты маеш віну,
бо зусім не шкадуеш прыроду.
А яна абвяшчае вайну
і нясе катастрофы народам.

Усе беды людзей з-за таго,
што збіваюцца часам у статак,
і не цэняць адзін аднаго,
і руйнуюць спрадвечны пачатак.

Расчыняючы дзверы ў нябыт,
на свой шлях яшчэ раз азірніся,
кінь пагляд на жыцця краявід
і з усмешкай на момант спыніся.

Не спяшайся скакаць праз масток,
што схаваўся за тым небакраем.
Пі працягла апошні глыток...
Ну, а Вечнасць? Яна пачакае.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

# ЗМЕСТ


*К. Камейша.* «Дарыць людзям душу»

*САДЫ СЕМІРАМІДЫ*

Незнаёмка
Сумнае свята
«Блукаючы завулкамі ілюзій...»
Абсурд
Сады Семіраміды
Фантазія
Эскіз
«Яшчэ адзін глыток начной атруты...»
«Не люблю за тое раніцу...»
Чорная ружа
«Я адна сяджу ў цішы...»
«Вясна... Цябе даўно чакалі...»
«Бурштынавы бераг...»
З нагоды мокрага снегу
Крымскі бераг
Музыка дажджу
Шахразада
Сарпссо
Зімовая саната
Суседу-гітарысту з верхняга паверха <
«Мабыць, варта было...»
«У жыцці — як на шахматнай дошцы...»
«Містэрыя пад назваю Тэатр...»

*ВЕТРАЗЬ КАХАННЯ*

«Я лаўлю твой пагляд...»
«Стаяла ноч. Духмяны водар...»
«Пройдзе час, і вось цябе я страчу...»
Крыху аб каханні
«Пакліч мяне, і я прыйду...»
Дзіўнае віно
«У попелператворыцца папера...»
«Ці ты бачыць мяне не хочаш...»
Ветразь Кахання
«Я не бачу цябе. Мае вочы...»
«Твой смех падобны да вострае брытвы...» •
«Мы абое чагосьці шукалі...»
Пакутлівая ілюзія
Спакуса
«Калі б вядомы Херсанес...»
Вандроўны Галандзец
«Ты не зваблівай, не спакушай...»
Гэта ноч...
Песня менестрэляў

*БЕЛАРУСКІЯ МАТЫВЫ*

«Душа мая — вандроўніца...»
«О святая зямля Беларусі!..»
Беларусь
«Мова — быццам кветка тая...»
У купальскую ноч
Вялікадзяржаўнікам
«Горкія рысы...»
«Мой самотны і велічны край!..»

*КРЫЛЫ ПЕГАСА*

Крылы Пегаса
Credo
«Ляжыць знаёмы сшытак на стале...»
«Кажуць, што паэ,ты...»
Начныя рыфмы
«Заўсёды творчасць і мастацтва...»

*У ПОШУКАХ ІСЦІНЫ*
Аўтапартрэт
Sub specie aeternitatis
«Не трэба аб мінулым сумаваць...»
«Ах, колькі незвычайных скарбаў...»
Акраверш
Бяссэнснасць
«Культура — кволае стварэнне...»
Я не люблю
Прысуд
«Жыццё часам здаецца мне...»
«Заснуць ад водару магнолій...»
«Дайце мне, дайце каваиачак неба!..»
«Нахапаўшыся нігілізму...»
«Якое цяжкае жыццё!..»
«З упартай сілай лес імкнецца...»
«Я праклінаю гэты лес!..»
«Я — актрыса ў тэатры абсурду...»
«Дзьміце ў трубы і біце ў літаўры!»
«Мне кажуць людзі: стань прасцей...»
«У нас з табою розныя шляхі...»
«Я стану тою зоркаю...»
Сузіранне.

Хадарэнка I.

Чорная ружа: Вершы / Прадм. К. Камейшы.— Мн.: Маст, літ., 1998.— 94 с.— (Першая кніга паэта).

ISBN 985-02-0223-8.

Паэзія для Ірыны Хадарэнкі — адзін са шматлікіх спосабаў самасцвярджэння і асэнсавання жыцця. Вершы паэткі вылучаюцца імпульсіўнасцю і філасафічнасцю, мінорным, задуменным настроем. Для яе творчасці характэрныя тэматычная разнастайнасць, абвостранасць пачуццяў.

Паэтычная думка I. Хадарэнкі мае праекцыю у будучыню, што дае маладой паэтцы магчымасць ствараць футуралагічныя метафары.